# Весці БДПУ

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

**№ 1(51) 2007**

**СЕРЫЯ 2.**
**Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія**



***Галоўны рэдактар:***
**П. Дз. Кухарчык**

***Рэдакцыйная калегія:***
Н. Г. Алоўнікава
А. І. Андарала
(*нам. галоўнага рэдактара*)
У. В. Амелькін
В. А. Бондар
М. К. Буза
В. В. Бушчык
(*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў
(*нам. галоўнага рэдактара*)
І. В. Бялько
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Г. А. Космач
У. М. Котаў
Н. І. Кунгурава
М. В. Лазаковіч
І. Я. Левяш
М. І. Лістапад
А. М. Люты
У. А. Мельнік
І. А. Новік
В. М. Русак
А. І. Смолік
В. Дз. Старычонак
В. Б. Таранчук
А. І. Таўгень
І. С. Ташлыкоў
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
А. С. Цернавы
Л. Н. Ціханаў
І. І. Цыркун
М. Г. Ясавееў


## Змест

### *Гісторыя*


*Пуцік У. С.* Асвятленне гісторыкамі ўздзеяння сацыяльных працэсаў у аграрнай сферы вытворчасці на грамадска-палітычнае жыццё Беларусі (канец XIX — пачатак XX ст.) ........ 3

*Біндараў А. В.* Руская Праваслаўная Царква ў нацыянальна-рэлігійнай палітыцы расійскага самаўладдзя ў Беларусі ў 1894—1914 гг.: гістарыяграфічны і крыніцазнаўчы аналіз ........ 8

*Крывіцкая К. В.* Арганізацыя ўзброеных сіл Вялікага княства Літоўскага ў перыяд вайны 1812 г. ........ 12

*Здановіч К. В.* Судовая рэформа 1864 г. у Беларусі ........ 16

*Башмакоў А. А.* Гістарыяграфія гісторыі мануфактурнай вытворчасці ў Беларусі ў 1861—1900 гг. ........ 18

*Трубчык П. А.* Нацыянальнае пытанне ў дзейнасці канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі ў Беларусі ў перыяд рэвалюцыі 1905—1907 гг. ........ 22

*Сарока А. Г.* Дзейнасць курсаў па перападрыхтоўцы загадчыкаў хат-чытален і народных дамоў у Савецкай Беларусі ў 20-я гг. XX ст. ........ 25

*Крыварот А. А.* Баявое ўзаемадзеянне беларускіх і расійскіх партызанскіх фарміраванняў 1942—1944 гг. ........ 30

*Рабцава Н. А.* Падрыхтоўка кваліфікаваных рабочых кадраў чыгуначнага транспарту ў перыяд аднаўлення народнай гаспадаркі Беларусі (1944—1950 гг.) ........ 35

*Янкоўская Т. У.* Дзяржаўная палітыка ў сферы працы і занятасці моладзі Беларусі ў 90-я гг. XX ст. ........ 38

*Дзмітрук І. П.* Дзейнасць органаў дзяржаўнага кіравання ў сферы маладзёжнай палітыкі: (1992—1994 гг.). ........ 42

*Бурая Н. В.* Уплыў дзяржаўнай палітыкі на развіццё нацыянальных і канфесіянальных адносін у Беларусі (1992—2004 гг.) ........ 46

*Субоцін А. Г.* Канфлікт Баварыі і рэйха. 1922 г. ........ 49

*Скарабагатая І. А.* Палітычная дзейнасць нацыянал-сацыялістаў Аўстрыі ў гады сусветнага эканамічнага крызісу (1929—1932 гг.) ........ 53

*Воранава Т. В.* Францыя і ФРГ: праблемы ўзаемаадносін у 80-я гг. XX ст. ........ 56


### *Філасофія*


*Кузняцоў А. У., Таркан І. І.* Касмацэнтрычная парадыгма сацыяльных ведаў і сучасны дыялог культур ........ 60

*Крыштаповіч Я. А.* Метакультурныя асновы гістарычнага працэсу ........ 64

*Ігнатовіч А. Л.* Неасакратаўскі метад у рашэнні праблем пазнання ........ 68

*Шымбалёў А. А.* Навуковае пазнанне і астралогія ........ 72

*Сайганава В. С.* Нормы навуковай рацыянальнасці і іх гістарычная дынаміка ........ 78


РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

# ЭКАНОМІКА

УДК 339.1

Л. М. Давыдзенка, Гражына Міхальчук

## ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫ КАПІТАЛ ЯК ФАКТАР УЗРАСТАННЯ РЫНАЧНАЙ ВАРТАСЦІ ПРАДПРЫЕМСТВА

***Уводзіны.*** Рынычная вартасць сучаснага прадпрыемства абумоўлена шматлікімі фактарамі, якія можна прылічыць да дзвюх катэгорый. Адна з іх звязана з матэрыяльнымі актывамі, якія выступаюць у выглядзе фінансавых ці апрадметненых рэсурсаў. Другая датычыцца нематэрыяльных актываў (інтэлектуальнага капіталу) — ведаў і уменняў супрацоўнікаў, культуры арганізацыі, інфармацыйных рэсурсаў, пісем кліентаў і г. д.

Змяненні, што ўзнікаюць у прыродзе і сутнасці эканамічнай актыўнасці прадпрыемстваў, уплываюць на рост інтэлектуальнага капіталу ва ўтварэнні вартасці фірмы. Аб гэтым сведчыць розніца, якая павялічваецца паміж рыначнай вартасцю прадпрыемства і вартасцю актываў нета ў балансе (табліца 1).

Для дасягнення поспеху прадпрыемства на рынку яно павінна валодаць уменнямі ідэнтыфікацыі кампанентаў інтэлектуальнага капіталу, практычнай здольнасцю іх выкарыстання, уменнем пастаяннага набыцця і павелічэння. Аднак мадэль бізнесу, у якой інтэлектуальны капітал адыграе істотную ролю, мае шанц на поспех пры ўмове, што кіраўнік прадпрыемства будзе ўсведамляць як існаванне інтэлектуальнага капіталу, так і яго сувязі з матэрыяльнымі актывамі — актывамі апрадметненымі і фінансавымі. Гэтага вельмі складана дасягнуць з прычыны таго, што як тэорыя, так і практыка кіравання, а таксама бухгалтэрыя не маюць да гэтага часу аднолькавай дэфініцыі характарыстыкі і класіфікацыі інтэлектуальнага капіталу. Сам тэрмін таксама не прымяняецца дакладна, бо часта выкарыстоўваецца папераменна з такімі азначэннямі, як: нематэрыяльныя рэсурсы, нематэрыяльныя вартасці, інтэлектуальныя актывы ці нематэрыяльныя актывы. Незалежна ад выкарыстанага тэрміна можна прыняць, што інтэлектуальны капітал уяўляе нематэрыяльныя рэсурсы асобы, што не маюць фізічнай або фінансавай велічыні, спрыяюць генерыраванню прытоку будучай выгады і ўплываюць істотным чынам на вартасць фірмы [*Dobija*, 2003, с. 38].

*Мэта артыкула* — адлюстраванне сутнасці і кампанентаў інтэлектуальнага капіталу, якія з'яўляюцца вызначальнікамі рыначнай вартасці сучасных прадпрыемстваў.

***Сутнасць і рысы інтэлектуальнага капіталу.*** У дзейнасці сучасных прадпрыемстваў вялікае значэнне набывае выкарыстанне унікальных рэсурсаў нематэрыяльнага характару, якія вызначаюцца інтэлектуальным капіталам — IC (Intellectual Capital). Нягледзячы на тое што значэнне нематэрыяльных акты-

***Табліца 1*** **— Супастаўленне рыначнай і бухгалтарскай вартасцей выбраных таварыстваў, каціраваных на біржах каштоўных папер у Польшчы**

| Таварыства | Вартасць (у млрд зл.) Рыначная (MV) | Вартасць (у млрд зл.) Бухгалтарская (BV) | MV – BV (у млрд зл.) | MV/BV | (MV – BV)/MV (у %) |
|---|---|---|---|---|---|
| PKO BP | 43,0 | 9,4 | 33,6 | 4,6 | 78,1 |
| Bank Pekao | 35,5 | 8,1 | 25,4 | 4,4 | 71,5 |
| Bank PBH | 25,4 | 6,3 | 19,1 | 4,0 | 75,1 |
| BZ WBK | 15,6 | 3,2 | 12,3 | 4,9 | 78,8 |
| Żywiec | 5,4 | 1,2 | 4,2 | 4,3 | 77,7 |
| Boryszew | 1,6 | 0,4 | 1,2 | 4,0 | 75,0 |
| LPP | 1,4 | 0,2 | 1,2 | 7,0 | 85,7 |
| Cersanit | 5,5 | 0,2 | 5,3 | 27,5 | 96,3 |

**MV — BV** — адрозненні паміж рыначнай вартасцю таварыстваў і іх бухгалтарскай вартасцю (вартасць актываў нета), якія ілюструюць ацэначную вартасць інтэлектуальнага капіталу (нематэрыяльных актываў).

**Крыніца:** уласная распрацоўка на аснове біржавых каціровак таварыстваў і фінансавых рапартаў www.interia.pl <http://www.interia.pl> (даныя на 29 лістапада 2006 г.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ваў[1] у стварэнні каштоўнасці фірмы павялічваецца, гэта пытанне яшчэ не да канца вызначанае. Як тэорыя, так і практыка не выпрацавалі да гэтага часу адзінай, прынятай і абагульненай дэфініцыі інтэлектуальнага капіталу, таму вышэйадзначаныя вартасці абазначаюцца рознымі тэрмінамі: «інтэлектуальны капітал», «нематэрыяльныя актывы», «нефінансавыя актывы», «скрытыя актывы», «мяккія каштоўнасці».

У эканамічнай тэорыі ўпершыню тэрмін «інтэлектуальны капітал» быў выкарыстаны ў 1969 г. К. Гэлбрэйтам, які разумеў яго як увасабленне ступені інтэлектуальных дзеянняў, а не толькі як чысты інтэлект [*Bontis, 1988, с. 67*]. Першы ў свеце дырэктар па справах інтэлектуальнага капіталу *Edvinsson* прызнае інтэлектуальным капіталам веды, якія могуць быць заменены на вартасць [*Jarugowa; Fijalkowska, 2001, с. 59*]. А ў сумеснай дэфініцыі з *M. S. Malone* ён вызначае інтэлектуальны капітал як наяўнасць ведаў, вопыту, арганізацыйную тэхналогію, адносіны з кліентамі і прафесійныя ўменні, якія даюць магчымасць фірме павышаць канкурэнтаздольнасць на рынку (*Edvinsson; Malone*, 2001, с. 39—40].

*T. Stewart* інтэлектуальным капіталам прызнае інтэлектуальную матэрыю — веды, інфармацыю, інтэлектуальную ўласнасць, вопыт, якія могуць быць элементам фарміравання вартасці [*Nogalski; Rybicki, 2001, с. 82*].

Іншыя дэфініцыі інтэлектуальнага капіталу вызначаюць яго як:

1. Суму скрытых актываў прадпрыемства, якія не зусім зафіксаваны ў бухгалтарскім уліку прадпрыемства, але ахопліваюць як тое, што знаходзіцца ў розумах членаў арганізацыі, так і тое, што застаецца ў прадпрыемстве, калі яны з яго выходзяць [*Strojny, 2003, с. 103*].

2. Інтэлектуальную матэрыю, якая матэрыялізавана, выяўлена і выкарыстана для раздачы высакаякасных актываў [*Jarugowa; Fijalkowska, 2001, с. 59*].

3. Менеджэрскія веды, якія выкарыстаны ў працэсах прадпрыемства і могуць ствараць дабаўленую вартасць [*Perechuda, 1998, с. 64—65*].

4. Адрозненне паміж рынкавай вартасцю і бухгалтарскай вартасцю, г. зн. сумай скрытых актываў, поўнасцю не зафіксаваных у балансе фірмы [*Edvinsson; Malone, 2001, с. 39—40*].

5. Эканамічную вартасць двух неадчувальных актываў (intangible assets) прадпрыемства, г. зн. арганізацыйнага капіталу (структурнага) і людскога капіталу [*International…, 1999*].

6. Актывы, заснаваныя на ведах, якія з'яўляюцца ўласнасцю прадпрыемства і якія становяцца крыніцай будучых даходаў фірмы [*Dzikowski, 1998*].

Прадстаўленыя азначэнні інтэлектуальнага капіталу з'яўляюцца аднымі з многіх, якія стварылі як тэорыя, так і гаспадарчая практыка[2], што прадвызначана адрозненнем па канцэпцыі і тэрміналогіі. Для адлюстравання сутнасці гэтай катэгорыі аўтары прымаюць або больш шырокія, або вузкія азначэнні.

Нягледзячы на адрозненні ў азначэнні інтэлектуальнага капіталу, аналіз прадстаўленых паняццяў дазваляе ідэнтыфікацыю рыс, характарызуючых інтэлектуальны капітал, якія адрозніваюць яго ад традыцыйна матэрыяльных актываў і даюць падставу для аналізу ўзаемных суадносін і сувязей паміж інтэлектуальным капіталам і матэрыяльнымі актывамі. Такім чынам, інтэлектуальны капітал:

- выступае ў нематэрыяльным выглядзе;
- складаецца з розных кампанентаў, часта рознага характару і прыроды, якія фарміруюць адрозненне паміж агульнай рынкавай вартасцю прадпрыемства і яго балансавай вартасцю;
- не ўмяшчаецца ў традыцыйнай мадэлі бухгалтарыі і ўяўляе перш за ўсё пазабалансавыя рэсурсы з пункту гледжання фінансавай справаздачнасці;
- вырашае пытанне аб канкурэнтнай перавазе прадпрыемства пры правільным яго выкарыстанні;
- укладанні яго ў развіццё нематэрыяльных актываў звязаны, з аднаго боку, з высокай рэнтабельнасцю, а з іншага — з павышаным узроўнем рызыкі.

***Кампаненты інтэлектуальнага капіталу.*** Прадстаўленыя дэфініцыі пацвярджаюць, што не існуе адна, у агульным плане структура паняцця інтэлектуальнага капіталу. На думку *Brennana* і *Corella*, адрозненні паміж асобнымі дэфініцыямі інтэлектуальнага капіталу з'яўляюцца вынікам розных узроўняў злучэння яго элементаў. Выбраныя канцэпцыі дзялення інтэлектуальнага капіталу ілюструе табліца 2.

Пры аналізе прадстаўленых канцэпцый кампанентаў інтэлектуальнага капіталу, большасць з аўтараў адрозніваюць *тры* яго асноўныя кампаненты:

1. *Чалавечы капітал,* які з'яўляецца асноўным элементам інтэлектуальнага капіталу, уяўляе базіс для астатніх элементаў інтэлектуальнага капіталу, а таксама аснову для атрымання выгады з наяўнага ў асобы апрадметненага і фінансавага капіталаў. Ён з'яўляецца са-

[1] У артыкуле папераменна будуць выкарыстаны азначэнні «інтэлектуальны капітал» і «нематэрыяльныя актывы».

[2] Пры азначэнні інтэлектуальнага капіталу, можна прывесці фармулёўкі спецыялістаў, якія займаліся дадзенай галіной [Itami, Hall, Sveiby, Teece, Sullivan, Lev, Petrash, Brooking, Kaplan, Norton і інш.].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Таблица 2* — **Канцэпцыі дзялення інтэлектуальнага капіталу**

| Аўтар | Кампаненты інтэлектуальнага капіталу |
|---|---|
| Kaplan i Horton | • Фінансавая перспектыва<br>• Кліенты<br>• Унутраныя працэсы<br>• Навучанне і рост |
| Petrash | • Чалавечы капітал<br>• Капітал кліентаў (суадносін)<br>• Арганізацыйны капітал (структурны) |
| Stewart | • Чалавечы капітал<br>• Структурны капітал<br>• Капітал, звязаны з кліентамі |
| Sveiby | • Знешняя структура (кліенты, рынак, сетка дыстрыбуцыі, наяўныя знакі, рэпутацыя і імідж прадпрыемства, супрацоўніцтва з іншымі фірмамі)<br>• Унутраная структура (патэнты, канцэсіі, ліцэнзіі, ноу-хау, тэхналагічныя рэсурсы, культура арганізацыі)<br>• Індывідуальныя кампетэнцыі супрацоўнікаў (адукацыя, прафесійныя кваліфікацыі, кіраўніцкае ўменне, кадры, верагоднасць кіраўнікоў) |
| Edvinsson, Malone | • Структурны капітал<br>• Чалавечы капітал |
| Mayo | • Арганізацыйны капітал, г. зн. нематэрыяльныя актывы, незафіксаваныя ў фінансавых справаздачах<br>• Рыначны капітал, г. зн. імідж фірмы, сукупнасць суадносін з кліентамі<br>• Чалавечы капітал, г. зн. веды, уменні, вопыт супрацоўнікаў і нематэрыяльныя актывы, уласнікамі якіх з'яўляюцца супрацоўнікі, а не прадпрыемства |
| Brooking | • Рыначныя актывы (рыначнае становішча, назва фірмы, сетка дыстрыбуцыі)<br>• Актывы інтэлектуальнай уласнасці (актывы, ахоўваемыя законам: патэнты, правы на публікацыі)<br>• Чалавечыя актывы (якасці, атрымліваемыя ад людзей, напрыклад, уменне рашаць праблемы)<br>• Інфраструктурныя актывы (філасофія кіравання, культура, інфармацыйныя сістэмы) |
| Bartnicki, Strużyna | • Грамадскі капітал<br>• Чалавечы капітал<br>• Арганізацыйны капітал |

MV—BV — адрозненні паміж рыначнай вартасцю таварыстваў і іх бухгалтарскай вартасцю (вартасць актываў нета), якія ілюструюць ацэначную вартасць інтэлектуальнага капіталу (нематэрыяльных актываў).

Распрацоўка аўтараў на аснове [*Sveiby, 2003*], [*Edvinsson; Malone, 2001, с. 33*], *Brooking, 1999, с. 16—21; Bartnicki; Struzyna, 2001*].

мым важным і адначасова найменш моцным кампанентам інтэлектуальнага капіталу.

Фактарамі, якія мяркуюць аб каштоўнасці чалавечага капіталу, з'яўляюцца ноу-хау супрацоўнікаў, іх уменні, здольнасці, наваўвядзенні, матывіроўкі і вопыт. Такім чынам, чалавечы капітал канцэнтруецца на каштоўнасці асобы ў эканамічным сэнсе і злучаецца з накопленай вартасцю ўкладанняў у навучанне супрацоўнікаў, іх кампетэнцыі, будучыню. Галоўнымі стваральнікамі вартасці ў фірмах павінны быць перш за ўсё супрацоўнікі са спецыфічнымі ўменнямі. Трансфармацыя іх ведаў у структуры фірмы ўяўляе падставу для стварэння структурнага капіталу арганізацыі. З пункту гледжання аналізу чалавечага капіталу як аднаго са стваральнікаў вартасці фірмы істотным з'яўляецца падзел на кіраўніцкія кадры і супрацоўнікаў. Яны адыгрываюць значную ролю. Задачай супрацоўнікаў з'яўляецца стварэнне чалавечага капіталу і кіраўніцкіх кадраў, правільнае выкарыстанне інтэлектуальнага капіталу з мэтай аптымізацыі будучага поспеху фірмы.

2. *Арганізацыйны капітал* (унутраны структурны капітал) ахоплівае ўсе механізмы і структуры прадпрыемства, якія дазваляюць асобе найбольш эфектыўна выкарыстоўваюць і павялічваюць чалавечы капітал. У межах арганізацыйнага капіталу часцей за ўсё пералічваюцца дзве групы кампанентаў. Першая ўяўляе інтэлектуальную ўласнасць, у склад якой уваходзяць патэнты, ліцэнзіі, таварныя знакі і г. д. Другая — вытворчы капітал, які складаецца з усіх унутраных працэсаў (узнаўленчыя працэсы, маркетынгавыя і г. д.), мадэлі (методыка праектавання), сістэмы IT і дакументацыя.

3. *Капітал кліентаў* (знешні структурны капітал) ідэнтыфікаваны з сувязямі, існуючымі па-за арганізацыяй. Ён датычыцца іншых сетак пастаўшчыкоў, маркі і кліентаў, якія ўяўляюць не толькі непасрэдную крыніцу стварэння грашовага патоку, але таксама з'яўляюцца адной з важнейшых крыніц канкурэнтнай перавагі. Фінансавым адлюстраваннем капіталу кліента з пункту гледжання арганізацыі з'яўляецца жыццёвая каштоўнасць кліента, якая дысканціруецца вартасцю выгады нета (прыбытку нета або cash flow), якую стварае прадпрыемства на здзелках з дадзеным кліентам у перы-

РЕПОЗИТОРИЙ БНТУ




***Рысунак* — Важнейшыя пазіцыі кампанентаў інтэлектуальнага капіталу**

**Распрацоўка на аснове** [*Kasiewicz; Rogowski; Kicinska*, 2006, с. 83—97].

яд, калі здзяйсняе пакупкі ў фірме [*Kasiewicz; Rogowski; Kicinska, 2006, с. 94—95*].

Інтэлектуальны капітал утвараецца ў працэсе стварэння вартасці, заснаванай пры ўдзеле асобных кампанентаў яго фарміруючых (чалавечага капіталу, арганізацыйнага капіталу і капіталу кліентаў), а сувязі паміж імі сумесна рашаюць пытанне аб яго вартасці. Таму істотнай сёння праблемай з'яўляецца ўменне вымярэння важнейшых кампанентаў інтэлектуальнага капіталу, якія ілюструе рысунак.

Рынкавая вартасць прадпрыемства вызначаецца толькі матэрыяльнымі элементамі і залежыць ад актыўнай вартасці грашовых патокаў, ствараемых дзякуючы наяўнаму на прадпрыемстве інтэлектуальнаму капіталу. Ён з'яўляецца крыніцай інавацыі, яго камбінацыі з папаўняючыміся актывамі, якія ствараюць унікальную з імі сувязь, што дае магчымасць трансфармаваць інавацыі на прыбытак прадпрыемства і астатніх актываў [*Antczak*, 2004, с. 32].

Інтэлектуальны капітал як вытворца вартасці адыгрывае галоўную ролю перш за ўсё на прадпрыемствах, заснаваных на ведах (камунікацыйных, фармацэўтычных, інфармацыйных). Ён можа павялічваць вартасць двума спосабамі [*Dudycz*, 2005, с. 241]:

• непасрэдна спрыяючы генерыраванню дабавачнай вартасці (дзякуючы лаяльнасці кліентаў, таварнаму знаку, марцы);

• шляхам злучэння з папаўняючыміся актывамі, што дазваляе генерыраваць грашовыя патокі (памяншаць вартасць вытворчасці, атрымліваць адпаведную якасць прадуктаў).

***Заключэнне.*** Варта падкрэсліць, што важнейшымі крыніцамі вартасці прадпрыемства з'яўляюцца кампаненты інтэлектуальнага капіталу. Гэтыя новыя крыніцы разам з існуючымі да гэтага часу фінансавымі генератарамі вартасці фарміруюць у сукупнасці абумоўленую сістэму фактараў, якія спрыяюць павелічэнню вартасці фірмы на працяглы перыяд часу.

Узрастаючае значэнне інтэлектуальнага капіталу схіляе практыкаў і тэарэтыкаў да распрацоўкі канцэпцыі і інструментаў, якія дазваляюць эфектыўна кіраваць гэтай формай актываў. На працягу апошніх некалькіх гадоў з'явілася мноства прапаноў, якія датычацца канцэптуалізацыі інтэлектуальнага капіталу і метадаў, якія дазваляюць эфектыўна імі кіраваць. Аднак спецыфічная рыса інтэлектуальнага капіталу, якая датычыцца перш за ўсё фізічнага памеру або (і) фінансавай меры, выклікае цяжкасці ў азначэнні, а таксама класіфікацыі.

Нягледзячы на гэтыя цяжкасці, ідэнтыфікацыя і выяўленне ролі, якую выконвае інтэлектуальны капітал у сучасных арганізацыях, мае істотнае значэнне для эфектыўнасці кіравання, бо:

• дае магчымасць разумець нематэрыяльныя актывы і іх уплыў на стварэнне вартасці фірмы;

• паляпшае ўнутраную структуру фірмы і асабліва кіраванне яе матэрыяльнымі і нематэрыяльнымі актывамі;

• павышае ўзровень дзейснасці і магчымасці існавання некадыфікаваных працэсаў, якія ўзнікаюць у арганізацыі.

Літаратура

1. *Давыденко, Л. Н.* Знания как стратегический ресурс экономического развития предприятия / Л. Н. Давыденко // Экономика. Управление. Право. — 2003. — № 4. — С. 3—5.
2. *Antczak Z.* Kapital intelektualny przedsiebiorstwa. Wybrane zagadnienia praktyki i teorii zarzadzania funkcja personalna w swietle badan, Antykwa. — Warszawa-Kluczbork, 2004.
3. *Bartnicki, M., Struzyna, J. (red.).* Przedsiebiorczosc i kapital intelektualny, Wydawnictwo Akademii Ekonomicznej w Katowicach. — Katowice, 2001.
4. *Bontis, N.* Inellectual Capital: an Exploratory Study that Develops Measures and Models, «Managements Decision» 1988, nr 36/2.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. *Brooking, A.* Corporaate Memory. Strategies for Knowledge Memory, «Interational Thomson Business Press». — London, 1999.
6. *Dobija, D.* Pomiar i sprawozdawczosc kapitalu intelektualnego przedsiebiorstwa, Wyzsza Szkola Przedsiebiorczosci i Zarzadzania im. Leona Kozminskiego. — Warszawa, 2003.
7. *Dudycz, T.* Zarzadzanie wartoscia przedsiebiorstwa. PWE. — Warszawa, 2005.
8. *Dzikowski, R.* The Measurement and Management of Intellectual Capital: an Introduction, International Federation of Accountants. — New York, 1998.
9. *Edvinsson, L., Malone, M. S.* Kapital intelektualny, Wydawnictwo naukowe PWN. — Warszawa, 2001.
10. *Jarugowa, A., Fijalkowska, J.* Rachunkowosc i zarzadzanie kapitalem intelektualnym. Koncepcje i praktyka, ODDiK. — Gdansk, 2002.
11. *Kasiewicz, S., Rogowski, W., Kicinska, M.* Kapital intelektualny. Spojrzenie z perspektywy interesariuszy, Oficyna Ekonomiczna. — Krakow, 2006.
12. *Marcinkowska, M.* Kapital intelektualny jako zrodlo przewagi konkurencyjnej, [w:] Wycena i zarzadzanie wartoscia firmy, (red.) A. Szablewski, R. Tuzimka, Poltext. — Warszawa, 2005.
13. *Nogalski, B., Rybicki, J.* Zarzadzanie portfelem kapitalu intelektualnego, [w:] Kapital intelektualny-dylematy i wyzwania (red.) A. Pocztowski, Wyzsza Szkola Biznesu, Nowy Sacz, 2001.
14. *Perechuda, K.* Metody zarzadzania przedsiebiorstwem, Wydawnictwo Akademii Ekonomicznej Wroclaw. — Wroclaw, 1998. S. 64—65.
15. *Pietruszka-Oryl, A.* Kapital intelektualny wyznacznikiem poziomu zasobow niematerialnych w przedsiebiorstwie, [w:] Przedsiebiorstwo jako swiatynia wiedzy, (red.) W. Cieslinski, Wydawnictwo Wyzszej Szkoly Zarzadzania i Przedsiebiorczosci. — Walbrzych, 2002.
16. *Strojny, M.* Metody i narzedzia pomiaru kapitalu intelektualnego w organizacji, [w:] Pomiar i rozwoj kapitalu ludzkiego przedsiebiorstwa: materialy na konferencje, (red.) D. Dobija, Polska Fundacja Promocji Kadr i Zarzadzania. — Warszawa, 2003.
17. *Sullivan, P. H., Brie, A.* History of the Intellectual Capital Movement, w: <http://www.sveiby.com/articles/ >
18. *Sveiby, K. E.* The Intangible Assets Monitor, www.sveiby. com/articles, 14 grudnia 2003



SUMMARY

*The market value of the company cannot be perceived solely from the angle of material resources in the current market situation.*

*The achievements of modern organizations should be assessed from the angle of intellectual capital. To achieve success, not only should the company have intellectual capital, but also it should have an ability to use them in a practical way to a greater extent as well as have the ability of sustained raising and accumulating such assets. It requires then a new structure of financial management in modern corporations.*


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*УДК 338: 371*

***Л. У. Запольская***

# ГАСПАДАРЧЫ МЕХАНІЗМ І ЯГО АСАБЛІВАСЦІ Ў АДУКАЦЫІ

Даследаванне гаспадарчага механізма ў сістэме адукацыі і шляхоў яго трансфармацыі ўяўляецца актуальным як у галіне тэарэтычных пытанняў, так і ў практычным плане. Шматгадовы вопыт паказвае, што без удасканалення гаспадарчага механізма, без стварэння цэласнай, эфектыўнай і гібкай сістэмы кіравання адукацыяй, без рэгулюемых рынычных адносін цяжка вырашыць сацыяльна-эканамічныя праблемы адукацыі. Рашэнне эканамічных і сацыяльных праблем, якія ўзнікаюць у ходзе развіцця сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь, у значнай ступені залежыць ад дасканаласці прымяняемых форм і метадаў гаспадарання.

Што ж уяўляе сабой гаспадарчы механізм сучаснага грамадства?

У межах наяўных тэарэтычных уяўленняў катэгорыя «гаспадарчы механізм» адлюстроўвае складанае і шматпланавае ўтварэнне, якое з'яўляецца неад'емным атрыбутам, складальнай часткай спосабу вытворчасці. З дапамогай дадзенага паняцця характарызуецца пэўная сістэма форм і метадаў арганізацыі гаспадарання, якая забяспечвае вытворчасць, размеркаванне, абмен і спажыванне матэрыяльных даброт ва ўмовах абмежаваных рэсурсаў у адпаведнасці з уласцівымі спосабу вытворчасці адносінамі ўласнасці.

Відавочна, што кожнаму спосабу вытворчасці ўласцівы свой асобы гаспадарчы механізм, сацыяльна-эканамічная прырода якога і «набор» яго асноўных элементаў цалкам вызначаюцца сутнасцю дадзенага ладу. Канкрэтны змест гаспадарчага мехнізма і яго асноўных элементаў на працягу спосабу вытворчасці можа даволі істотна змяніцца. Гэта звязана з агульнай эвалюцыяй таго ці іншага спосабу вытворчасці ад стадыі да стадыі. Аднак гаспадарчы механізм беспярапынна эвалюцыяніруе і мадыфікуецца і ў рамках кожнай з фаз і стадый развіцця спосабу вытворчасці. Гэта ўласцівасць гаспадарчага механізма да пастаяннага «падстройвання» к зменам ва ўзроўні і характары развіцця прадукцыйных сіл і вытворчых ад-